**У. А. Навумовіч**

# КАНЦЭПЦЫЯ “ЭПІЧНАГА ТЭАТРА” БЕРТОЛЬДА БРЭХТА І ДРАМАТУРГІЯ АНДРЭЯ МАКАЁНКА

Беларуская літаратура – народная трыбуна. Ды і сапраўды, іншай трыбуны, апроч літаратуры, у народа не было і не магло быць. Беларуская літаратура з’яўлялася асяродкам болю і трывог, надзеі, спадзяванняў на лепшую долю, крыніцай пазнання псіхалогіі народа, формай выпрацоўкі самасвядомасці. Самапазнанне, самавызначэнне і самасцвярджэнне сталі асновай літаратурнага развіцця ў гістарычным аспекце. Устанаўленню неза-

лежнасці Беларусі ў многім садзейнічала тое, што беларускае слова – вуснае і друкаванае – захоўвалася на працягу многіх і многіх стагоддзяў. Мастацтва слова ўсхваляла дасягненні беларускага народа ў культуры, асвеце, навуцы, эканоміцы, грамадскім жыцці.

Беларуская літаратура – літаратура агульначалавечых духоўных каштоўнасцей. Менавіта беларускай літаратуры наканавана адлюстраваць актыўныя намаганні народа і краіны па будаўніцтве суверэннай дзяржавы, уславіць моцную і квітнеючую Беларусь. Беларуская літаратура дала свету больш, чым свет ведае пра яе. У апошія гады развіцця літаратур народаў свету шырока праяўляюцца новыя тэндэнцыі ў раскрыцці ўзаемаадносін мікрасвету (чалавека) і макрасвету (прыроды). Актывізуюцца адкрытыя дыялогі ў тэатрах, дзе разбураецца дыстанцыя паміж гледачом, глядзельнай залай і сцэнай, ацёрамі, якія выконваюць адпаведныя ролі, даносяць "меседж" сённяшнага, а таксама ўчарашняга і заўтрашняга дня. Чалавек на сцэне. Кожны дзень узыходзіць і заходзіць сонца. Адкрываецца вялікая заслона жыцця, дзе адбываюцца вострыя і складаныя драмы жыцця чалавека.

Адным з першых, хто звярнуўся да праблемы "эпічнага тэатра" быў Бертольд Брэхт – нямецкі драматург, празаік, паэт, рэжысёр, тэарэтык мастацтва, рэаліст. "Рэальнае мастацтва – баявое мастацтва. Яно змагаецца супраць падманных поглядаў на рэчаіснасць і супраць імпульсаў, якія супярэчаць рэальным інтарэсам чалавецтва". У час першай сусветнай вайны – прадстаўнік у літаратуры так званага страчанага пакалення, куды адносяцца Эрых Марыя Рэмарк, Эрнэст Хемінгуэй, Рычард Олдынгтан, Анры Барбюс. Перакананы пацыфіст. Хлапчукі ідуць на вайну, але вайна – зло, яна разбурае гарады і сёлы, але яшчэ горш, што яна "разбурае" душы людскія. П'есы "Мамаша Кураж і яе дзеці", "Што той салдат, што гэты", "Легенда пра мёртвага салдата", "Трохграшовая опера". Антываенныя п'есы Бертольда Брэхта энергічныя, выразныя, плакатныя. Адзін за другім гінуць сыны мамашы Кураж і яна гаруе па дзецях так шчыра і пранікнёна, як гаруюць героі старагрэчаскай трагедыі. Брэхт засноўвае тэатр як трыбуну для выяўлення сваіх поглядаў. Марыў пра павучальную п'есу, хацеў ператварыць тэатр у "педагагічную дысцыпліну". Тэатр павінен выхоўваць. Тэатр – факультэт свабодных мастацтваў, як у класічных універсітэтах свету. Глядач павінен не толькі давяраць таму, што адбываецца на сцэне, але і рабіць вывады аб тым, што "закладзена" ў п'есе. Бар'ер паміж гледачом і сцэнай знікае, каментарыі, як правіла, робіць сам аўтар, часцей у форме своесаблівых куплетаў, невялічкіх вершаў. Разам з Хеленай Вайгель, жонкай і актрысай, Брэхт засноўвае тэатр "Берлінскі ансамбль", спектаклі якога выклікалі незвычайны рэзананс у тэатральным свеце.

Лірыка – самавыражэнне. Эпас – погляд нібыта "з боку", панарамнае, маштабнае адбіццё падзей і вобразаў. Драма – дзеянне. Самае球 рознае: камічнае, трагедыйнае, драматычнае.

"Эпічны тэатр" – адкрытая размова пісьменніка аб набалелым. Выдатным майстрам сатыры і гумару з'яўляецца драматург Андрэй Макаёнак. Смех – катэгорыя эстэтычная. Сатыра і гумар у беларускай літаратуры маюць даўнія і трывалыя традыцыі. Адценні смехавой культуры ў сусветнай класіцы таксама надзвычай багатыя. Макаёнак вядзе дыялог з чытачом і гледачом.

Заслуга Андрэя Макёнка ў тым, што ён “вывеў” беларускую драматургію да шырокага гледача на прасторы Расіі, Украіны, ад Прыбалтыкі да Закаўказзя, Сярэдняй Азіі. Бывалі гады, што п’есы А. Макаёнка ішлі больш чым на 80 сцэнах свету. У Марыборы (Славенія), Польшчы, Чэхіі, Славеніі, Македоніі. Камедыя “Выбачайце, калі ласка” створана ў традыцыях крапівінскай камедыяграфіі ў беларускай літаратуры. Прытчава-філасофскі, падкрэслена інтэлектуальны характар мае п’еса “Зацюканы апостал”. Шырока выкарыстоўвае камедыёграф прыёмы народнага лубка і фарсу ў мастацкай структуры трагікамедыі “Трыбунал”. У творы шырока паядналіся традыцыі трагічнага і камічнага. Гучаць парадыйна-сатырычныя інтанацыі. Шмат увагі звяртаў драматург на актуальныя праблемы вясковай рэчаіснасці ў п”есах “Лявоніха на арбіце”, “Таблетку пад язык”. Вострыя маральна-этычныя праблемы агульначалавечага характару ўздымаюцца ў камедыі “Святая прастата” (“Кашмар”). Мае сваю адметнасць сатырычная камедыя “Пагарэльцы”. Сэнс і сімволіка п’ес Макаёнка неадназначныя. Творы апелююць да чалавечай свядомасці, да сумлення кожнага чалавека. Творы маюць выразныя рысы “эпічнага тэатра” Бертольда Брэхта. У драматычных творах пісьменніка заўсёды ставіліся надзённыя пытанні. Аўтар адкрыта звяртаўся да гледача. Перад кожнай пастаноўкай у тэатры гучаў голас драматурга, папярэдне запісаны на магнітафоннай стужцы. Можна заключыць, што традыцыі “эпічнага тэатра” Бертольда Брэхта драматург Андрэй Макаёнак шырока развіваў у кожным сваім творы. “Ідучы на спачынак, запытай сябе сам: што ты зрабіў сёння? Падвядзі вынікі справам тваім. Можа чужое проса вытаптаў? Пакрыўдзіў каго? Аблаяў? Чым гэта павернецца для цябе, для людзей заўтра? Праз год? Праз дзесяць гадоў? Успомніць аб гэтым не сорамна будзе табе? Што ты зрабіў сёння?.. Дрэва пасадзіў? Проса пасеяў?” Вёўся зацікаўлены і шчыры дыялог з гледачом.

Андрэй Макаёнак – адзін з яркіх прадстаўнікоў таго пісьменніцкага пакалення, якія падрыхтоўвалі перабудову ў грамадстве, духоўную перабудову самога чалавека.